# БЕЛАРУСКІ ЛЕН: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

**А. В. Капілевіч**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік М. У. Буракова, канд. філал. навук, дац.

Лен, або «паўночны шоўк» (так называюць беларускі лен) – валокназмяшчальная культура, рэсурсы якой узнаўляюцца штогод. Яго значэнне з кожным годам павышаецца з ростам выкарыстання натуральных валокнаў у розных галінах.

Выбар тэмы абумоўлены тым, што беларускі лен выклікае асаблівую павагу і інтарэс у сувязі з адраджэннем на Беларусі льнаводства і выкарыстанне льняной сыравіны ў тэкстыльнай вытворчасці, пра што сведчыць і рэспубліканская праграма «Лен» на 2012–2015 гг. Аб’ектам нашага даследавання стала пытанне аб выкарыстанні лену, а прадметам вывучэння – льняная прадукцыя ААТ «Рэчыцкі тэкстыль».

На беларускай зямлі лен вырошчваецца са старадаўніх часоў. З валакна ткалі палатно і шылі вопратку, стваралі выдатныя прадметы побыту, майстравалі цацкі для дзяцей. Блакітныя кветкі лену ўпрыгожваюць сучасны герб Беларусі, якія з’яўляюцца сімвалам пераўтваральнай працы, а таксама знакам дабра і дастатку. Пра лен спявалі, яму прысвячалі вершы, пра яго складалі прыказкі і прымаўкі. Янка Купала апісаў прыгажосць ільну так: «Ой, лянок, лянок мой чысты, валакністы, залацісты!», а Ларыса Геніюш напісала: «То ня сонца пазалотай пакацілась на загон, то ня ўвосень ля балота загарэўся пышны лен». У народзе казалі, што «Лен усіх апранае» і «Лен – кашуля ў полі». Чыстая і светлая льняная адзежа служыла эмблемаю нявіннасці і маральнай чысціні, таму маладая дзяўчына, выходзячы замуж, апранала сукенкі, зробленыя з ільнянога матэрыялу.

Прыгажосць і зручнасць льняной тканіны цэняць ва ўсім свеце, а папулярнасць яе расце з кожным годам. На вялікі жаль, традыцыйная льняная прадукцыя ў сучасных беларусаў не мае вялікай папулярнасці. Вырабы айчыннай вытворчасці ў агульным аб’еме тавараў складаюць невялікі працэнт, а іх якасць значна саступае замежным аналагам. Беларусь захавала патэнцыял вырошчвання лену, але не змагла выкарыстаць яго для пераарыентацыі на высакаякасныя спажывецкія тавары, якія ведалі б унутры краіны і за яе межамі. З беларускага лену працягваюць вырабляць незапатрабаваную тэхнічную прадукцыю, што звязана з нядаўнім прошлым Беларусі.

У савецкі час беларускі лен выкарыстоўваўся больш для тэхнічных мэт – выраб вяроўкі, мешкавіны, брызенту. Напрыклад, сучаснае рэчыцкае тэкстыльнае таварыства, а ў мінулым майстэрня-арцель «Чырвоны Кастрычнік», пачынала сваю дзейнасць менавіта з выпуску тэхнічнай прадукцыі, улічваючы наяўнасць у раене

патрэбнай ільняной сыравіны. Зараз ААТ «Рэчыцкі тэкстыль» – гэта адзінае ў сваей галіне прадпрыемства ў рэспубліцы, якое мае самае сучаснае абсталяванне і таму здольнае рабіць самае разнастайнае аздабленне тавараў. Але быў перыяд, калі прадпрыемства ледзь не апынулася на парозе банкруцтва, а льняная прадукцыя перастала выпускацца з-за сваей нерэнтабельнасці (гл. табліцу).

| **Прадукцыя (па відах)** | **Аб’ем выпуску** | | |
|---|---|---|---|
| | **2009** | **2010** | **2011** |
| Ткані баваўняныя | 1588 | 1484 | 1689 |
| Ткані шоўкавыя | 131 | 123 | 91 |
| Ткані льняныя | 0 | 0 | 9 |

Своечасовая мадэрнізацыя (тэхпераўзбраенне асноўных яго вытворчасцей) вывела ААТ «Рэчыцкі тэкстыль» з крызіснага стану, дапамагла ўкараніць сучасныя тэхналогіі вытворчасці, палепшыць спажывецкія ўласцівасці вырабаў, ажыццявіць шэраг мераў па асваенні нетрадыцыйных тавараў. Прадукцыя мае самую шырокую каляровую гаму. Так як спажыўцы цікавяцца больш натуральнымі традыцыйнымі валокнамі, таму зараз распрацоўваецца вялікая калекцыя з выкарыстаннем ільну і катальну (спалучэнне бавоўны з ільном), а таксама чыстага льну і бавоўны. Вельмі прыемна, што ААТ «Рэчыцкі тэкстыль» прымае ўдзел у вырабе сувенірнай прадукцыі для ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі, што пройдзе ў Беларусі ў 2014 г.

У апошнія гады на прадпрыемстве ўсе больш пашыраецца і ўкараняецца габеленавае ткацтва, якое для Беларусі з’яўляецца традыцыйным. Па сваім выглядзе яно напамінае тое, што рабілі ў даўніну нашы беларускія дзядулі і бабулі. Адрозненне толькі ў тым, што на прадпрыемстве гэтае ткацтва робіцца не ўручную, а на самым сучасным абсталяванні Для захавання нацыянальных традыцый на прадпрыемстве мы прапануем стварыць музей-краму беларускага ручнога ткацтва, дзе былі б адлюстраваны ўсе працэсы апрацоўкі і падрыхтоўкі лену.

Здаўна на Беларусі паўсюднае пашырэнне мела традыцыйнае народнае ткацтва. Сыравінай для яго служылі лен, воўна, пянька. Працэсы яе апрацоўкі і падрыхтоўкі выконваліся ўручную: ніткі пралі з дапамогай верацяна і прасніцы (з канца 19 ст. – і калаўрота), бялілі ці фарбавалі іх (у адварах з кары дрэў, раслін, кветак), ткалі на ручных ткацкіх станках-кроснах, з канца 19 ст. – іх тэхнічна ўдасканаленых варыянтах – варштатах, якія пашырылі тэхналагічныя і мастацкія магчымасці [1, с. 370].

Народ заўседы выступаў сапраўдным творцам і носьбітам самабытных этнакультуралагічных традыцый, якія ен беражліва захоўваў і клапатліва развіваў, перадаючы як сакральны дар у спадчыну сваім нашчадкам. Складваючыся з цягам часу ў «зладжаную і гарманічную сістэму жыццевых правіл, маральных норм, прыярытэтаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў, міфалагічных і мастацкіх вобразаў, працоўных навыкаў, народныя традыцыі служылі магутнай маральна-ахоўнай сілай, інтэлектуальным рэсурсам, што вызначаў жыццяздольнасць народа і яго самабытнай культуры» [1, с. 5].

Вялікую ролю адыгрывае адраджэнне забытых традыцый беларускага народа ў фарміраванні светапогляду сучаснай моладзі, выхаванні патрыятызму, а таксама спрыяе ўсведамленню ўнікальнасці таго куточка зямлі, на якім мы жывем, бачыць, у чым яго адметнасць і самабытнасць.

Літаратура

1. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова ; маст. І. І. Бокі, У. М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.
2. Рэжым-доступу: http://www.textil.by.